**КЛЕ́ТНІК**, Клецянік, Клецусь, ахоўнік клецяў. Паводле ўяўленняў беларусаў, кожны гаспадар мае свайго К., як і Цмока-Дамавіка. Але розніца паміж імі ў тым, што апошні прыносіць грошы свайму гаспадару, робіць яго нівы плоднымі, а кароў — дойнымі, нагул глядзіць усю яго гаспадарку, а К. пільнуе толькі клеці і клапоціцца пра ўсё, што там сабрана і складзена: адзежа, бялізна, палатно, ніткі, воўна, гародніна, насенне, грошы «ва ўклубах», але не тое, што сабрана ў полі, або сала, ялавічына і інш. Другая розніца між імі ў тым, што Цмок-Дамавік нібыта з карыслівасці вартуе дабро свайго гаспадара, які штодня пячэ яму яечню, а К. без усялякай узнагароды старанна клапоціцца пра дабрабыт гаспадара. Калі дапамогі Цмока-Дамавіка можна пазбавіцца, не прыгатаваўшы яму яечню, то К. нічым не аддаліш ад сябе: ён з-за аднае любові да апякуемага беражэ яго клець, толькі патрабуе, каб гаспадар дбайна клапаціўся пра збор сваіх пасеваў. К. не вінаваты, што ў гаспадара няшмат назапашанага ў клеці, ён не мае права дабаўляць, павялічваць колькасць маёмасці ў клецях, бо гэта азначала б увайсці ў межы ўлады Цмока-Дамавіка. Беларусы вельмі цанілі апякунства К. як добрага, спачувальнага духа, які, калі прадбачыць патрэбу сялян ці неўраджай, з'яўляецца ім у сне змрочны, з голай галавою, дае парады, або перасцерагае, каб не раскашавалі. У звычайны час яго ўяўлялі вясёлым, усмешлівым дзедам з доўгімі залацістымі валасамі на галаве, з такімі ж вусамі і з сівою, незвычайнай велічыні барадою. На галаве ў яго мужчынскі завой залацістага колеру, кісці рук калматыя. Хада ў К. вясёлая, хуткая і смелая. Удзень ён ніколі не паяўляецца. Звесткі пра К. зафіксаваны ў Мінскай (Ігуменскі і Барысаўскі паветы) і Магілёўскай губернях. Сустракаліся ў народзе і выразы: «На клецьніка паспадзяваўся, спазаранку разгуляўся», «Клецусь, Клецусь! А ў Клеці знекусь» — г.зн. спадзявайся на К., а ў клеці пуста; «Барджэй да Клецьніка, калі грошай нямашака».

*Літ.*: Древлянский П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1852. Лит. прибавление №3.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ